УДК 94(476)

# РОЛЯ ГАЗЕТЫ "ГОМАН" У ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ ВІЛЕНСКАГА КРАЮ

***Міхаіл Цуба***
*Пінск, Беларусь*

У артыкуле аналізуецца грамадзянская пазіцыя занятая калектывам беларускай газеты "Гоман" у пачатку XX стагоддзя на прыкладзе апублікаванных у гэтым выданні матэрыалау.

***Ключавыя словы: Беларусь, друк, "Гоман", Першая сусветная вайна***

Першая сусветная вайна суправаджалася значнай актывізацыяй розных арганізацый і груповак нацыянальных рухаў. Галоўнае значэнне меў накірунак не з партыйнай спецыфікай дзейнасці, а з нацыянальнай. Будучы ў цяжкім становішчы, наколькі дазвалялі абставіны, грамадскія арганізацыі імкнуліся нават ва ўмовах ваеннага часу весці пэўную работу, скіраваную на маральна-культурную падтрымку сваіх нацыянальнасцяў. Гэта выявілася ў збіранні і захаванні помнікаў гісторыі і культуры, а таксама ў стварэнні  самых розных таварыстваў і камітэтаў . Так створаны на аснове Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (БТДПВ)  Беларускі народны камітэт (БНК) у Вільні на  прыканцы 1915 года заснаваў сваё выдавецтва, а з прыватных ахвяраванняў стварыў фінансавы фонд і арганізаваў друкаванне новых школьных падручнікаў першай неабходнасці.

Разам з кнігадрукаваннем, дзякуючы новаму беларускаму выдавецтву, пачала адраджацца і беларуская перыёдыка. З  15 студзеня 1916г. у Вільні двойчы на тыдзень стала выходзіць беларуская газета "Гоман". Спачатку яна друкавалася лацінкай, а з 1 верасня 1916 – кірыліцай. Газету рэдагавалі В.Ластоўскі , да лета 1917 года, а затым Я.Салавей. Амаль ва ўсіх публікацыях "Гоман" выступаў за нацыянальна-культурнае адзінства беларускага народа.На сваіх старонках газета часта закранала дзейнасць культурна-асветных і гуманітарных таварыстваў.

Шмат увагі ў ей удзялялася прапагандзе гістарычнага мінулага на беларускіх землях.Газета надрукавала шэраг артыкулаў аб гісторыі існаваўшых традыцый у Вялікім княстве Літоўскім, у тым ліку артыкул " Што было і

што павінна быць”. Разумеючы, якое вялікае значэнне для самаўсведамлення беларусаў мае забытая гістарычная спадчына, рэдакцыя “Гомана” у сваёй публікацыі  “У 400-летнюю гадаўшчыну” высока ацаніла асветніцкую дзейнасць Ф.Скарыны, а ў артыкуле “Памяці справядлівага” (1916 г.) В.Ластоўскі прывёў біяграфічныя звесткі “па загінуўшым барцу за беларускае адраджэнне святой памяці Касьцюку Каліноўскім” [2, с. 287–288].

Шмат артыкулаў газета прысвяціла актуальным сацыяльна-палітычным праблемам, як, напрыклад, “Што такое дэмакратызм” і “Шляхам творчасці”-аўтар В.Ластоўскі; “Нашы патрэбы” , “Фальшывыя прыяцелі”,” Новы клас”, “Да дзяржаўнай еднасці”, “Палажэнне работнікаў”, “Места і вёска”, “Да родных ніў”- аўтар А.Луцкевіч; “Хто ты гэткі?”- аўтар Ф.Аляхновіч і інш.

“Народ беларускі- як сяляне і работнікі , так і інтэлігенты,знайшлі ўрэшце спосаб галосна на ўвесь свой Край , загаварыць аб сваіх крыўдах,сваіх патрэбах і жаданнях,”  [1, с. 2]- пісала газета. На яе старонках змяшчаліся распараджэнні акупацыйных улад, вялася барацьба з польскім засіллем, шмат месца адводзілася пад літаратурныя творы і гісторыка-публіцыстычныя матэрыялы. Засяроджваючы ўвагу на асветніцкіх і грамадска-выхаваўчых функцыях беларускай літаратуры ў культурна-нацыянальным адраджэнні беларускага народа, газета змяшчала творы- Ф.Багушэвіча, Я. Купалы, Я.Коласа,М.Багдановіча, Цёткі, М. Гарэцкага, З.Бядулі, А. Гаруна, А. Гурло, Ц.Гартнага, Я.Баршчэўскага, А. Абуховіча і іншых.

Газета асвятляла дзейнасць Дзяржаўнай думы, друкавала інфармацыю з франтоў, паведамленні германскага генеральнага штаба. Найбольш вядомыя рубрыкі газеты: “У Вільні і ваколіцах”, “З усяго свету”,” З усяго краю”, “Весткі з Расіі”, “Весткі беларускіх кнігарняў”,камерцыйная рэклама і інш. [3, с. 60–61]

Нямецкія акупацыйныя ўлады, якія далі дазвол на рэдагаванне газеты, у далейшым не  перашкаджалі яе выданню, хаця “Гоман” актыўна выступаў за стварэнне незалежнай Беларускай рэспублікі або федэратыўнага “Беларуска-Літоўскага краю”. “Гасударства, як форма бытавання народу, -пісаў “Гоман”,-можа быць знішчана, разбіта, ды яно ў канцы канцоў адбудуецца нанава: калі толькі сам народ захаваў у сабе іскру жыцця, творчую сілу!”. [4, с. 2]

Лічачы найвышэйшай каштоўнасцю для “вольнага грамадзяніна” нацыянальную незалежнасць, “Гоман” сваімі публікацыямі падводзіў беларускае насельніцтва да ўспрыняцця гэтага: “Край, каторы жыў калісь са-

мабытным, незалежным жыццём, каторы мае свой асаблівы ўклад жыцця, утвораны сталеццямі,- гэта не звычайны шматок зямлі,- напамінала газета акупантам. Край наш-той жывы арганізм; які мае свае асобенныя патрэбы, мае адвечныя ідэалы шчаснага існавання, мае жаданні, якія тутэйшае грамадзянства, звязанае неразрыўна з нашай зямлёй, выказвала ў даволі яркай форме як калісьці, так і цяпер-у часы вайны"[5, с. 1]

Прапагандуючы ідэі беларускасці, газета звязвала вялікія спадзяванні з людзьмі працы, якія ў цяжкі ваенны час абудзяцца ад сну і пасля вайны возьмуць лёс бацькаўшчыны у свае рукі. У адным з нумароў "Гоман" сцвярджаў : "Работніцкі клас, праўда шмат працярэблены гэтай вайной, многа сіл яго найбольш чынных-загінула ў гэтай вайне. Але тым ярчэй выяўляецца сіла і значэнне яго ў грамадскім жыцці. І работнікі жадаюць адплаты за іх непамерны труд дзеля абароны іх бацькаўшчыны. І гэта адплата ім належыць бяспорна, і яны возьмуць яе сабе так ці іначай, калі ўрэшце скончыцца нячутае ў гісторыі крывавае змаганне мільённых армій"[6, с. 2].

Уважлівы аналіз публікацый на старонках "Гомана" сведчыць пра тое, што яго погляды, накіраванасць і гістарычныя ацэнкі тых ці іншых падзеяў мінуўшчыны прынцыпова не разыходзіліся з пазіцыяй газеты "Наша ніва". Адной з галоўных задач "Гомана", як у свой час, і "Нашай нівы" была мэта – выхаваць сярод беларусаў веру ва ўласныя сілы. У шматлікіх артыкулах газета трактавала беларускую нацыю як суб'ект, а не аб'ект гісторыі і палітыкі. Выказвалася ўпэўненасць, што беларусы захавалі вялікі патэнцыял для развіцця сваёй нацыянальнай індывідуальнасці, што павінна ўзбагаціць агульначалавечую, сусветную скарбніцу культуры. У той жа час газета выступала з абвінавачваннем і асуджэннем тых беларусаў, якія цураліся адраджэнскай справы, забываючы сваё роднае, беларускае. Яны называліся "унутраным ворагам", што атаясамлялася з непавагай гэтых беларусаў да саміх сябе, да сваёй роднай мовы, адсутнасцю нацыянальнага гонару і годнасці.

Патрэбна адзначыць, што шматлікія публікацыі "Гомана" адрозніваліся выразнай антыпольскасцю. Аўтарам большасці гэтых публікацый быў Антон Луцкевіч, які падпісваўся псеўданімам "І.Мялешка" .У адным з такіх артыкулаў "Добрая навука" А.Луцкевіч аналізуе абставіны распаду ў лютым 1916 года Віленска-Ковенскага грамадзянскага камітэта. Асноўнай прычынай ён лічыць тое, што польскія дзеячы, якія складалі палову ўсіх сяброў камітэта, не пажадалі працаваць на карысць усяго краю, думаючы

толькі пра ўласна польскія нацыянальныя інтарэсы, тым самым паралізаваўшы дзейнасць усіх камісій камітэта. У лютым 1916 года ў артыкуле "Перамена фронту" А.Луцкевіч зноў адкрыта абвінавацiў мясцовую польскую грамадскаць у антыбеларускай дзейнасці. Ранейшую прыхільнасць да беларускага руху, якая была характэрна для некаторых польскіх дзеячаў, аўтар тлумачыў толькі іх упэўненасцю і думкай, што беларусы пасля вызвалення ад расійскага панавання "зліюцца з палякамі, аддаючы ўсе свае творчыя сілы польскай справе"[7, с. 357, 358].

Роль "Гомана" была вялікай не толькі ў тым, што газета прапагандавала, паднімала і абгрунтоўвала вышэй прыведзеныя стасункі беларускага нацыянальнага руху, але яшчэ і ў тым, што сам факт выдання беларускай газеты паказаў як акупацыйным уладам, так і іншым нацыянальнасцям, якія жылі ў гэтым рэгіёне, што беларуская нацыя існуе не толькі ў асяроддзі пэўных груповак дзеячаў-інтэлігентаў, але і сярод той мільённай беларускамоўнай супольнасці, якая пражывае пераважна ў сельскай мясцовасці.

Лаяльнасць нямецкіх вайсковых улад да газеты можна растлумачыць тым, што Германія, хоць і была супраць стварэння незалежнай беларускай дзяржавы на захопленых ёй землях, усё ж не магла не заахвочваць тыя сілы, якія імкнуліся да паслаблення расійскага ўплыву ў дадзеным рэгіёне. Разам з тым, нямецкія ўлады, будучы не зацікаўленымі і ў стварэнні незалежнай беларуска-літоўскай дзяржавы, але і няздольныя германізаваць захопленую тэрыторыю, вымушаны былі даць выхад выбуховай нацыянальна-вызваленчай энергіі народаў, кантралюючы і накіроўваючы яе ў асноўным на нацыянальна-культурнае і асветнае рэчышча. Тым не менш, такая пазіцыя з боку германскіх улад давала пэўную свабоду дзейнасці беларускаму нацыянальнаму руху разам з газетай "Гоман".

1. Мялешка, І. 10-летні юбілей беларускай прэсы / І. Мялешка // Гоман. – 1916. –24 кастрычніка.

2. Кісялёў, Г. Радаводнае дрэва:Каліноўскі-эпоха-наступнікі / Г.Кісялёў. – Мінск: Маст. літ., 1994. – 303 с.

3. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. –Т.3 / Беларус.энцыкл.; Рэдкал.: Г.П. Пашкоў і інш. – Мн.: БелЭн,1996. – 527 с.

4. Мялешка, І. Аснова быту / І. Мялешка // Гоман. –1916. – 14 лістапада.

5. Мялешка, І. Напамінанне / І. Мялешка // Гоман. – 1916. – 19 снежня.

6. Г. Б. Зарплата работнікам / Г.Б. // Гоман. – 1916. – 6 кастрычніка.

7. Смалянчук, А.Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г / А.Ф. Смалянчук. – СПб.: Неўскі пр.; 2004. – 406 с.



Полесгу